# ТОП – 5 кніг пра Вялікую Айчынную вайну

Праходзяць дні, змяняюцца пакаленні, але нязменнай застаецца адно – памяць аб свяшчэннай Перамозе. Для сучаснай моладзі Вялікая Айчынная вайна – гэта далёкая гісторыя. Менавіта са старонак кніг пакаленне, якое нарадзілася больш чым праз паўвека пасля Перамогі, можа даведацца пра подзвіг савецкіх салдат, мужнасць працаўнікоў тылу, усяго савецкага народа і пераняць эстафету памяці і павагі, стойкасці і гераізму продкаў, іх беззаветнай любові да сваёй Айчыны.

Прапануем Вашай увазе творы беларускіх пісьменнікаў, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне, і заклікаем да іх чытання.




**Афяроўскі, А.Р. Любачка: раман / Аляксандр Афяроўскі. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2013. – 494с.**

*Галоўная гераіня рамана – дзіця Вялікай Айчыннай вайны. Маці, вясковая настаўніца нямецкай мовы, нарадзіла яе ад фашысцкага афіцэра, каб выратаваць трох маленькіх сыночкаў. Гэтая акалічнасць паўплывала на ўсё жыццё Любачкі…*




**Брава, А. Дараванне = Прощение = Vergebung: аповесць / Алена Брава; пераклад на нямецкую мову Андрэ Бёма. – Мінск: Выдавецкі дом «Звязда», 2013. – 208 с.**

*Беларуска Ларыса Вашкевіч з дапамогай шлюбнага агенства знаёміцца з немцам, бярэ шлюб, і пераязджае з дачкой у невядомую, чужую краіну. Ужо ў Германіі яна дазнаецца, што бацька мужа Ганс Краўцэ пакутуе на хваробу Альцгеймера, а ў час вайны як раз знаходзіўся ў родных мясцінах Ларысы. Гэта навіна моцна ўзрушвае жанчыну, бо атрымліваецца, што яна мусіць даглядаць чалавека, які мог быць датычным да забойства землякоў. Хвароба старога немца прагрэсуе, і ён не дае Ларысе спакою ні днём, ні ноччу. Штосьці шукае, кагосьці ратуе, ад кагосьці хаваецца. Пасля чарговага пабегу з дому сын прымае рашэнне аддаць старога ў дом састарэлых. Разам з Ларысай ён завозіць бацьку ў адну з такіх устаноў. Ларыса прыбірае пакой свёкра і знаходзіць ягоныя дзённікі. З іх даведвацца, што падчас вайны ён закахаўся ў беларускую дзяўчыну Зосю, якая жыла ў роднай вёсцы Ларысы, і ўсялякімі шляхамі спрабаваў уратаваць і яе, і яе аднавяскоўцаў. Такім чынам атрымлівалася, што і сёння ён шукае Зосю, змагаецца за яе жыццё. Ларысу гэта вельмі ўзрушвае…*




**Быкаў, В.У. Пакахай мяне, салдацік: аповесці, апавяданні / Васіль Быкаў. - Мінск: Мастацкая літаратура, 2013. - 572, [2] с.**

*Кранальная гісторыя кахання ў апошнія дні Вялікай Айчыннай вайны. На далёкай чужыне, у ваколіцах невялікага гарадка ў альпійскіх Альпах, Змітрок Барэйка з Бешанковічаў і яго зямлячка Франя пазналі пачуццё кахання. У біяграфіі маладога лейтэнанта ёсць “плямы”: быў у харкаўскім акружэнні, на акупіраванай тэрыторыі засталіся яго бацькі, былі партызанамі, але прапалі без вестак. Вакол Барэйкі, як воран, кружыць “заўжды жвавы” асабіст. Спатканні Змітрака з зямлячкай, што апынулася за мяжой, актывізавалі дзікую падазронасць палкавога асабіста. Усё гэта паралізоўвала волю юнака, парушала яго намер адразу забраць каханую з сабой. А яна ў вайну напакутавалася не менш, чым Барэйка: ратавацца даводзілася і ад фашыстаў, і ад “сваіх”. Прыехаўшы за дзяўчынай з намерам усё ж забраць яе, Барэйка ўбачыў сваю каханую мёртвай. Для Змітрака ж радасць перамогі ператварылася ў “чорнае свята бяды”.*




**Савіцкі, А. Обаль: раман / Алесь Савіцкі. – Мінск: Выдавецкі дом «Звязда», 2013. – 464 с.**

*Раман – роздум пісьменніка пра вытокі гераізму моладзі, якая паўстала на самаахвярную барацьбу з фашызмам на тэрыторыі акупіраванай Беларусі. У аснове твора – аповед пра ўзнікненне падполля «Юныя мсціўцы» у Обалі, невялікай чыгуначнай станцыі на Віцебшчыне, і гераічнае змаганне падпольшчыкаў з нямецкімі акупантамі. Галоўныя героі твора – рэальныя асобы, арганізатары і актыўныя ўдзельнікі падполля: Фруза Зянькова, Зіна Партнова, Наталля Герман, Хведар Слышанкоў, Валянціна Шашкова, Ніна Азоліна, Надзя Дзяменцьева, браты Езавітавы, Мікола Аляксееў, Зоя Сафончык, Дзмітрый і Марыля Хрыбценкі, Аркадзь Барбашоў, Марыля Ушакова. Аўтар па-мастацку даследуе характары герояў рамана, праўдзіва паказвае абставіны, цяжкасці таго часу.*




**Шамякін, І. Глыбокая плынь: раман / Іван Шамякін. – Мінск, Мастацкаялітаратура, 1996. – 286 с.**

*Галоўная гераіня рамана Таццяна Маеўская ў першыя дні вайны выратоўвае яўрэйскага хлопчыка. Свайму бацьку Карпу, мачасе Палагеі, аднавяскоўцам яна гаворыць, што гэта яе сын. Мачаха выдае Таццяну і расказвае аб гэтым нямецкаму агенту Мацею Куляшу. Пасля гэтага да яе завітваюць паліцэйскія, ды Таццяна праяўляе смеласць і рашучасць. Яна забівае фашысцкіх паслугачоў, а сама з дзіцём і бацькам падаецца ў партызаны, каб помсціць ворагам.*